# «ДАРАГАЯ МАЯ РАЁНКА! ТЫ – МОЙ ЛЁС, МАЁ ЖЫЦЦЁ» (да 100-годдзя з дня нараджэння Івана Муравейкі)

***Т. М. Дасаева***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*вул. Кальварыйская, 9, 220004, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь,*
*Dasaeva@bsu.by*

Аналізуецца журналісцкая дзейнасць І. Муравейкі. Прасочваюцца этапы функцыянавання любанскай раённай газеты.

***Ключавыя словы:*** раённая газета; калектыў рэдакцыі; журналіст рэгіянальнага выдання; чытацкая аўдыторыя.

# «MY DEAR REGIONAL NEWSPAPER! YOU ARE MY DESTINY, MY LIFE» (on the 100th anniversary of the birth of Ivan Muraveyko)

***T. M. Dasaeva***

*Belarusian State University,*
*9, Kalvariyskaya Str., 220004, Minsk, Republic of Belarus*
*Corresponding author: T. M. Dasaeva (Dasaeva@bsu.by)*

The journalistic activity of I. Muraveyka is analyzed. The stages of fun ctioning of the Lyuban regional newspaper are traced.

***Key words:*** regional newspaper; editorial staff; journalist of a regional newspaper; readership.

«Голас Любаншчыны» – рэгіянальнае выданне з працяглай і багатай на падзеі гісторыяй. Першы нумар газеты выйшаў 15 жніўня 1932 года пад назвай «Калгаснік Любаншчыны». У час Вялікай Айчыннай вайны выдавалася пад новай назвай – «Кліч Радзімы». З мая 1962 года – «Будаўнік камунізму», з кастрычніка 1991 года – «Голас Любаншчыны».

З любанскай раённай газетай цесна звязана журналісцкая дзейнасць Івана Андрэевіча Муравейкі – беларускага паэта, пісьменніка, франтавіка, члена Саюза пісьменнікаў Беларусі (1953); заслужанага работніка культуры Беларусі (1980); першага лаўрэата прэміі імя Васіля Віткі (1996); уладальніка літаратурнай прэміі «Залаты купідон» за кнігу «Вадзіца з крыніцы» (2006), пачэснага звання «Ганаровы член

Саюза пісьменнікаў Беларусі» (членскі білет № 1) і медаля Францыска Скарыны (2002); ганаровага жыхара г. Любань.

Іван Андрэевіч нарадзіўся 21 кастрычніка 1921 года ў сялянскай сям'і ў вёсцы Таль Любанскага раёна. Вучыўся ў Тальскай сямігодцы (школа калгаснай моладзі) і Любанскай сярэдняй школе. З маленства ў яго выявілася схільнасць да літаратурнай творчасці. «За актыўную дзяткораўскую работу двойчы атрымліваў прэміі – "Бібліятэку дзіцячай літаратуры"» [1, с. 337]. Марыў стаць пісьменнікам. «Іскрынку ў дзіцячым сэрцы запаліў "хросны бацька" дзядзька Волесь (Аляксандр), які быў малапісьменным, але адчуваў цягу да рыфмаванага слова, прыдумваў дасціпныя гумарыстычныя вершы і куплеты, у якіх высмейваў розныя хібы вяскоўцаў» [1, с. 337]. Яшчэ ў 4-м класе на здольнага вучня звярнуў увагу настаўнік, пісьменнік М. П. Лобан. Па ўспамінах І. Муравейкі, у яго літаратурным архіве з надпісам «Дзяцінства» захоўваюцца вучнёўскія вершы, нарысы і апавяданні, выразкі з газет. Адзін з першых нарысаў «Дзень у школе» быў надрукаваны ў раённай газеце «Калгаснік Любаншчыны», калі І. Муравейка вучыўся ў 8-м класе. Ён быў актыўным аўтарам не толькі раённай газеты, але і штодзённай акруговай – «Праўда на рубяжы».

«У рэдакцыі раённай газеты мяне лічылі сваім хлопцам, ледзь не штатным супрацоўнікам» [2, с. 21], – успамінаў Іван Андрэевіч. Калі юнак вучыўся ў дзясятым класе, рэдактар газеты П. Ц. Касцюкавец параіў яму паступаць у Мінскі камуністычны інстытут журналістыкі і даў рэкамендацыю. У 1939 годзе І. Муравейка паступіў у гэтую навучальную ўстанову, але вучобу давялося перапыніць, бо ў снежні гэтага ж года яго прызвалі на службу ў Чырвоную армію. У лістападзе 1944 года прызначаны літаратурным супрацоўнікам газеты «Наступление» 74-й гвардзейскай стралковай дывізіі. (Да гэтага пару месяцаў выконваў абавязкі карэспандэнта газеты «Красный воин» 47-й гвардзейскай стралковай дывізіі.) Пазней працаваў у рэдакцыі газеты «На защиту Родины» 8-й гвардзейскай арміі. З войскамі 1-га Беларускага фронту І. Муравейка дайшоў да Берліна і на сцяне рэйхстага пакінуў аўтограф: «Іван з Беларусі». У 1945–1947 гадах у складзе Цэнтральнай групы войск служыў у Германіі. Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны І і ІІ ступені, ордэнам Чырвонай Зоркі, медалямі.

Дэмабілізаваўся ў красаівку 1947 года і вярнуўся на Любаншчыну. З таго часу жыў у Любані. Без усялякіх ваганняў прыступіў да журналісцкай працы ў любанскай раённай газеце «Кліч Радзімы». «Магу без перабольшвання сказаць: журналістам я стаў у першую

чаргу дзякуючы раённай газеце. І аддаў ёй каля 40 гадоў свайго жыцця – са снежня 1948 да жніўня 1987 года. Дарэчы, свой шлях у вялікую журналістыку і літаратуру пачынаў у раёнцы не адзін я» [2, с. 21], – адзначаў Іван Андрэевіч.

З 1948 года працаваў адказным сакратаром любанскай раённай газеты «Кліч Радзімы». З 20 жніўня 1950 да 1 жніўня 1952 года – рэдактарам. У 1950–1961 гадах зноў сакратаром. У 1962 годзе – літсупрацоўнік раённай газеты «Будаўнік камунізму». У 1962–1964 гадах вучыўся ў Маскве на Вышэйшых літаратурных курсах, потым зноў працаваў адказным сакратаром любанскай раённай газеты «Будаўнік камунізму».

«Працаваць на рэдактарскай пасадзе ў тыя гады, мякка кажучы, было нялёгка: рэдактар знаходзіўся пад няспынным, строгім кантролем райкама партыі і галоўнага цэнзара, які перад выхадам газеты ў свет чытаў яе з першага да апошняга радка, адшукваючы “забароненае” і “шкоднае”, – успамінаў Іван Андрэевіч. У складаных сітуацыях выручаў журналісцкі вопыт, атрыманы ў дывізійнай і штодзённай армейскай газеце, дзе «навучылі быць вельмі ўважлівым, дысцыплінаваным, добрасумленным і прынцыповым, з павагай адносіцца да таварышаў па працы, да аўтараў» [2, с. 28].

Нягледзячы на вялікі аб’ём працы («работы – процьма, “нагружаны” цалюткі дзень» [2, с. 29]), Іван Андрэевіч адчуваў сябе вальней, чым на пасадзе рэдактара. Ён актыўна заняўся літаратурнай творчасцю, у выніку чаго адна за адной пачалі выходзіць яго паэтычныя кнігі: «Песня над палямі» (1953), «Ручаінкі» (1956), «Вось якія мы» (1958) і г. д. І. Муравейка «знайшоў» сябе ў дзіцячай паэзіі. Каля двух дзясяткаў кніг напісаў ён для сваіх маленькіх чытачоў. Ёсць у творчасці І. Муравейкі сатырычныя і гумарыстычныя вершы. Тэма Вялікай Айчыннай вайны ўвасоблена ў выданнях «Прынёс з вайны» (1991), «Была вайна» (2009), «Я – Іван з Беларусі» (2010, 2014). Родная Любаншчына апаэтызавана ў кнізе «Лебядзіная песня» (2006). Некаторыя вершы І. Муравейкі пакладзены на музыку.

Літаратурная творчасць І. Муравейкі плённа спалучался з журналісцкай дзейнасцю. Дзеля выяўлення таленавітай моладзі Іван Андрэевіч стварыў пры рэдакцыі газеты літаб’яднанне «Арэскія хвалі», ці, як яшчэ яго называлі – аддзел самабытных паэтаў. Ён рэгулярна праводзіў пасяджэнні, на якіх абмяркоўваліся творы мясцовых аўтараў, арганізоўваў літаратурныя вечары. Акрамя таго, кожны месяц рыхтаваў выпуск «Літаратурнай старонкі», на якой змяшчаліся творы непрафесійных аўтараў-землякоў, прычым рознага ўзросту: ад дзіцячага

да зусім сталага. Часта прысылалі па пошце ці прыносілі ў рэдакцыю свае вершы настаўнікі, калгаснікі, вучні і інш.

З усёй сур'ёзнасцю Іван Андрэевіч заяўляў: «Я лічу, што літаратурная творчасць – не забаўляльны занятак. Яна дапамагае чалавеку дастойна жыць, пераадольваць цяжкасці, бачыць прыгожае, адрозніваць дабро ад зла, любіць родны край. Чалавек піша – значыць марыць пра лепшае будучае сваё і Радзімы, радуецца ці смуткуе» [2, с. 29]. І. Муравейка нястомна выяўляў таленавітых землякоў і друкаваў іх творы. Сярод іх быў і мой бацька Мікалай Андрэевіч Жук – удзельнік партызанскай барацьбы супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў на Любаншчыне, настаўнік, паэт. Вось як пра гэта ўспамінаў Іван Андрэевіч Муравейка: «Мы з Міколам Жукам сябравалі шмат гадоў. Ён часта наведваўся ў Любань, у рэдакцыю раённай газеты, дзе я працаваў адказным сакратаром. Прыносіў свае вершы, і яны амаль усе друкаваліся ў раёнцы. Кожны верш уяўляў сабой адметны кавалачак жыцця, прапушчаны праз сэрца, адлюстроўваў палымяную любоў да Айчыны, да роднай зямлі, да людзей. Вобразнае паэтычнае слова Міколы Жука хвалявала чытачоў» [3].

Дзякуючы падтрымцы Івана Муравейкі Мікола Жук вярнуўся ў літаратурнае асяроддзе. З 1975 года яго вершы пачалі рэгулярна друкавацца ў любанскай раённай газеце, а потым і ў рэспубліканскіх перыядычных выданнях. А ў снежні 1995 года пабачыў свет паэтычны зборнік Міколы Жука «Ля падножжа маіх святынь», укладальнікам і аўтарам прадмовы да яго з'яўляецца пісьменнік Уладзімір Паўлаў, які пачынаў сваю журналісцкую дзейнасць у газеце «Будаўнік камунізму» і друкаваў там свае творы. На жаль, М. Жук не патрымаў у руках сваю доўгачаканую кнігу. Ён пайшоў з жыцця 14 кастрычніка 1995 года. Іван Андрэевіч Муравейка прысутнічаў на прэзентацыі кнігі свайго сябра, якая адбылася ў канцы 1996 года ва Урэцкай СШ, дзе працаваў М. Жук. А потым напісаў артыкул «Яго святыні. Слова пра Міколу Жука» і апублікаваў яго 9 студзеня 1997 года ў газеце «Голас Любаншчыны».

У нарысе «Голас Любаншчыны» Іван Андрэевіч засведчыў сваю адданасць раённай газеце, стварыў своеасаблівую панараму яе шматграннай дзейнасці, аддаў даніну павагі журналістам, якія працавалі ў газеце на розных этапах яе існавання, а таксама няштатным карэспандэнтам. Увогуле, ён лічыў вялікай заслугай рэдакцыі раёнкі падрыхтоўку высокапрафесійных журналістаў. Сярод іх М. Дастанка, В. Плешавеня, М. Язылец, У. Паўлаў, Н. Маеўская, В. Забалоцец, А. Андруховіч, М. Шчарбачэня, А. Аўрамчык і многія іншыя.

Характарызуючы пачатковы этап працы раённай газеты «Калгаснік Любаншчыны», ён спыніў сваю ўвагу на тым, што «перадваенныя рэдактары К. Г. Зайцаў і П. Ц. Касцюкевіч, супрацоўнікі рэдакцыі былі, бадай, самымі аўтарытэтнымі людзьмі на Любанчшыне» [2, с. 22]. Акрамя таго, «рэдакцыю газеты, якая тады размяшчалася ў звычайнай хаце, штодзённа наведвалі людзі з усяго раёна: хто – са скаргамі на несправядлівасць ці з прапановай, як ухіліць недахопы, хто – каб паведаміць навіну ці проста пагутарыць» [2, с. 22]. Іншымі словамі, супрацоўнікі газеты заўсёды былі набліжаны да сваіх чытачоў, ведалі ад іх саміх, што іх хвалюе.

У гэты перыяд разгарнуўся селькараўскі рух. Селькары былі амаль у кожнай вёсцы, яны з вялікай ахвотай пісалі ў газету. Дарэчы, як засведчыў І. Муравейка, «няштатныя карэспандэнты ніколі не зводзіліся – і ў даваенны і пасляваенны час» [2, с. 22]. З пашанай і ўдзячнасцю ўспамінаюць іх на Любанчшыне.

І. Муравейка адзначыў, што адметнае месца ў гісторыі раённай газеты займае Вялікая Айчынная вайна, гады акупацыі Любаншчыны нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Пад назвай «Кліч Радзімы» газета выдавалася ў падпольнай друкарні ў вёсцы Дварэц Загальскага сельсавета. Абсталяванне для яе прынеслі партызаны і падпольшчыкі з Любані ў верасні 1941 года, рызыкуючы сваім жыццём: у гарадскім пасёлку размяшчаўся тады буйны нямецка-паліцэйскі гарнізон. З 9 красавіка 1943 года да чэрвеня 1944 года выйшла 39 нумароў. Калектыў рэдакцыі складаўся з двух чалавек – рэдактара (спачатку выданне рэдагаваў Аляксандр Сакевіч, потым – Іван Куляшоў) і літсупрацоўніка (настаўнік Георгій Сыцько). Набіралі газету і лістоўкі Ніна Вязынская, Марыя Майстрэнка і Тамара Рагацкая [2, с. 23].

Азнаёміўшыся пасля вайны з матэрыяламі газеты-партызанкі «Кліч Радзімы», Іван Андрэевіч адзначыў, што яна была не менш баявой, чым газета гвардзейскай дывізіі «Наступление», у якой ён працаваў у якасці ваеннага журналіста.

Іван Андрэевіч з гордасцю пісаў: «Любаншчына – край партызанскай славы, а “востраў” Зыслаў быў партызанскай сталіцай, дзе знаходзіліся Мінскі падпольны абкам партыі і штаб Мінскага партызанскага злучэння, якім камандаваў Васіль Іванавіч Казлоў» [2, с. 10]. Тут, акрамя раённай газеты, выпускаліся рэспубліканскія – «Звязда» і «Чырвоная змена». Іх рэдагаваў вядомы журналіст Беларусі Міхаіл Барашкаў, а дапамагаў яму былы рэдактар любанскай раённай газеты «Калгаснік Любаншчыны» Піліп Касцюкавец [2, с. 25].

Згадвае І. Муравейка і першыя пасляваенныя гады, якія былі «гадамі напружанай, самаадданай працы ўсіх любанцаў без выключэння» [2, с. 26]. Трэба было будаваць жыллё, апрацоўваць і даглядаць палі. «Не хапала тэхнічных сродкаў, будаўнічых і іншых матэрыялаў, не хапала прадуктаў харчавання. Больш таго, не хапала рабочых рук» [2, с. 26]. Рэдакцыя райгазеты знаходзілася ў эпіцэнтры гэтых падзей. «Журналісты літаральна прападалі ў гаспадарках, нічога не заставалася па-за іх увагай. Галоўнымі рубрыкамі газеты былі: «Гераічнай працай, у кароткі тэрмін адновім родны край!», «Няхай зноў расквітнее наша Любаншчына!», «Больш хлеба Радзіме!» [2, с. 26].

«Журналісты і калектыў друкарні не толькі рэгулярна і своечасова выпускалі газету, але і працавалі ў вольны час у гаспадарках. Ездзілі на сваім старэнькім грузавічку, які падарыла рэдакцыі адна вайсковая часць, даглядалі пасевы, убіралі ўраджай, будавалі хаты. Гэта сёння можа здацца неверагодным. Але так было, было» [2, с. 26], – з захапленнем успамінаў Іван Андрэевіч.

За чатыры гады людзі перасяліліся з зямлянак у новыя хаты, зарунелі палі. «Ужо ў 1948 годзе хлебаробы саўгаса “Дзесяць год БССР” вырасцілі небывалы па тым часе ўраджай – па 30 цэнтнераў з гектара» [2, с. 26]. Любанскія журналісты ўслаўлялі працоўныя дасягненні землякоў, публікавалі свае матэрыялы не толькі ў раённай газеце, але і ў абласной, у рэспубліканскіх выданнях. Па словах І. Муравейкі, «яны нямала зрабілі для таго, каб узвысіць у чалавеку самыя найлепшыя якасці – працалюбівасць, сумленнасць, дабрыню» [2, с. 26].

Іван Андрэевіч раскрыў «сакрэт» папулярнасці любанскай раённай газеты, яе запатрабаванасці шырокай чытацкай аўдыторыяй: «Аглядваючыся і аналізуючы свой саракагадовы журналісцкі шлях, напэўна не памылюся, калі зазначу: у цэнтры ўвагі калектыву рэдакцыі райгазеты пастанна знаходзіўся чалавек-працаўнік. З яго радасцямі і засмучэннямі, з яго штодзённымі клопатамі і марамі. Таму і карысталася (і карыстаецца) наша раёнка папулярнасцю, ні адну газету не выпісвае столькі сем’яў… Па-ранейшаму людзі пішуць у сваю газету пра сваё жыццё-быццё, пра цяжкасці і непаладкі, спадзеючыся, што ім дапамогуць, падтрымаюць» [2, с. 27].

Урэшце, І. Муравейка абгрунтавана вызначыў пачэснае месца раённай газеты ў сістэме айчынных сродкаў масавай інфармацыі: «Часам даводзіцца чуць: а ці патрэбны раённыя газеты наогул? Маўляў, цяпер сталічных і абласных перыядычных выданняў навалам. Гэта так.

Але менавіта таму “раёнкі” патрэбны, запатрабаваны. Яшчэ як! Калі яны, не дай Божа, перастануць існаваць, мы востра адчуем, што нечага важнага не хапае ў нашым жыцці. Раённая газета для жыхароў сельскай “глыбінкі” – самы блізкі друкаваны орган, які хутка і аператыўна прыходзіць на дапамогу, з’яўляецца непасрэдным дарадчыкам чалавека, сям’і, калектыву» [2, с. 31].

Яркім сведчаннем заслуг раённай газеты «Голас Любаншчыны» з’яўляюцца яе высокія ўзнагароды: Ганаровая грамата Вярхоўнага Савета БССР і Ганаровая грамата Нацыянальнага Сходу Рэспублікі Беларусь.

Кранаюць словы прызнання Івана Андрэевіча Муравейкі, якімі ён завяршыў своеасаблівы «летапіс» Любанскай раённай газеты: «Дарагая мая раёнка! Будзь жа заўсёды баявой, справядлівай, шчыра служы людзям. Ты – мой лёс і маё жыццё» [2, с. 31].

На вялікі жаль, Іван Андрэевіч Муравейка пайшоў з жыцця 5 сакавіка 2021 года. Яму не давялося сустрэць свой 100-гадовы юбілей. Засталася добрая памяць пра гэтага незвычайнага чалавека – таленавітага, сціплага, сумленнага, добразычлівага. А яшчэ – яго багатая літаратурная спадчына і неацэнны вопыт журналісцкай дзейнасці.

Слова пра Івана Андрэевіча Муравейку хочацца закончыць сімвалічнымі радкамі з яго верша «Аб сабе»:

*Навек я з родным краем*
*падружыўся,*
*Ён моц дае,*
*адводзіць злыбяду.*
*Я ў дваццаць першым годзе*
*нарадзіўся*
*І ў дваццаць першым*
*да Яго пайду* [2, с. 64].

## Бібліяграфічныя спасылкі


1. *Гарэлік Л. М.* Муравейка Іван // Беларускія пісьменнікі : Бібліягр. слоўнік. У 6 т. Пад рэд. А. В. Мальдзіса. Мінск : БелЭН, 1994. 524 с.
2. *Муравейка І.* Лебядзіны край: нарысы, вершы. Любань, 2009. 68 с.
3. *Муравейка І.* Яго святыні: слова пра Міколу Жука // ЛіМ. 1997. 9 студз.
4. *Муравейка І.* Я – Іван з Беларусі: апавяданні, нарысы, успаміны, паэмы, балады, вершы / Іван Муравейка ; прадм. А. Карлюкевіча. Мінск : Выдавецкі дом «Звязда», 2014. 272 с.